# БІБЛІЯТЭКІ Ў ФОКУСЕ НАВАЦЫЙ

Дэлегацыя БДУ была запрошана на ўрачыстае **адкрыццё філіяла бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта –** Нацыянальнага цэнтра навуковай камунікацыі і інфармацыі адкрытага доступу.

У цырымоніі 6 лютага ўзялі ўдзел прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях У. В. Панарадаў, кіраўнік Дырэкцыі аб'ектаў будаўніцтва БДУ А. К. Казак і дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі П. М. Лапо.

Будынак цэнтра ўзводзіўся з лютага 2010 г. па май 2012 г. з ідэяй інтэграцыі ў навакольны ландшафт. Цэнтр знаходзіцца на тэрыторыі ляснога масіву і ўяўляе сабой 3 блокі рознай вышыні (3, 4 і 5 паверхаў), аб'яднаныя агульным падземным паверхам, якія імітуюць сабой вялізныя валуны.

Нягледзячы на такое арыгінальнае архітэктурнае рашэнне, будынак цэнтра цалкам функцыянальны. Агульная плошча – 14,6 тыс. м$^2$. Ёмістасць кнігасховішчаў – 1,8 млн адзінак захоўвання, адкрытыя для чытачоў стэлажы месцяць 300 тыс. кніг. Для падачы літаратуры з кнігасховішчаў выкарыстоўваецца тэлеліфт. Акрамя чытальных залаў у цэнтры ёсць пакоі для правядзення семінараў, групавой і індывідуальнай працы, рэкрэацыйная зона для карыстальнікаў, трансфармуемая канферэнц-зала з адпаведным прэзентацыйным абсталяваннем і кабінай для сінхроннага перакладу, службовая зона з рабочымі месцамі для персаналу. Упершыню ў Літве ўкаранёна супрацьпажарная сістэма Water Mist (сістэма «вадзянога туману»). Фінансаванне будаўніцтва і аснашчэння цэнтра было ажыццёўлена за кошт сродкаў Еўрапейскага фонду рэгіянальнага развіцця (85 млн літ) і рэспубліканскага бюджэту (15 млн літ) (разам каля 38, 8 млн дол. ЗША).

Цэнтр уяўляе сабой шматфункцыянальную бібліятэку, якая дзейнічае ў якасці цэнтра культуры, сацыяльных камунікацый і інфармацыі. Плануецца, што цэнтр, які ствараецца ў мікрараёне Саўлетыкіс г. Вільнюса, стане сэрцам кластара адукацыі, навукі і бізнесу, накшталт Сіліконавай даліны ў ЗША. Цяпер тут размешчаны чатыры факультэты Інстытута прыкладных даследаванняў Вільнюскага ўніверсітэта, большасць факультэтаў і бібліятэка Вільнюскага тэхнічнага ўніверсітэта імя Гедыміна, студэнцкія інтэрнаты. У найбліжэйшы час тут павінны быць пабудаваныя цэнтр фізікі і тэхналогій і цэнтр навук пра жыццё. Нацыянальны цэнтр навуковай камунікацыі і інфармацыі адкрытага доступу будзе абслугоўваць усю навуковую супольнасць, размешчаную ў «даліне», студэнтаў, якія тут жывуць, міжнародныя канферэнцыі, а таксама ўсіх жыхароў Вільнюса. Тут плануецца стварыць і бізнес-інкубатары.

Прадстаўнікамі БДУ ў фонд цэнтра былі перададзеныя навуковыя выданні БДУ, дырэктару бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта Ірэне Крывене ўручаны сувеніры з сімволікай нашага ўніверсітэта.

8 лютага на базе Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта ў г. Рыга быў адкрыты **Беларускі інфармацыйны цэнтр.**



Адкрыццё цэнтра з'явілася вынікам супрацоўніцтва беларускай дыяспары ў Латвіі, якая выступіла з ініцыятывай стварэння такога цэнтра, Латвійскага ўніверсітэта і пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвіі.

На ўрачыстым пасяджэнні з нагоды адкрыцця цэнтра пасля прывітальных прамоў рэктара Латвійскага ўніверсітэта Марцыса Аўзіньша і пасла Беларусі ў Латвіі А. М. Герасіменкі быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве шэрагу беларускіх ведамстваў і арганізацый з мэтай развіцця цэнтра. Ад БДУ мемарандум быў падпісаны прарэктарам БДУ па эканоміцы і інвестыцыях У. В. Панарадавым **(на фота)**.

Цэнтр створаны з мэтай садзейнічання ўмацаванню пазітыўнага іміджу Беларусі, развіцця эканамічных, навуковых, культурных і спартыўных сувязяў паміж Беларуссю і Латвіяй, пашырэння турыстычных магчымасцяў Беларусі.

Асноўнымі задачамі цэнтра з'яўляюцца кансалідацыя беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі, стварэнне ўмоў для ўстойлівых кантактаў беларускай дыяспары з беларускімі ўстановамі і абмен інфармацыяй па шырокім коле пытанняў. А яшчэ цэнтр плануе спрыяць прыцягненню ў беларускія ВНУ абітурыентаў з Латвіі і іншых балтыйскіх краін.

**Пётр ЛАПО,**
**дырэктар ФБ БДУ**